Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Маладэчне прайшлі суды за "Марш недармаедаў" (спіс асуджаных)

дапоўнена

11.03.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



ПЦ "Вясна" стала вядома, што ў дзевяць раніцы 11 сакавіка ў Маладэчанскім раённым судзе разглядалася справа актывіста Алеся Абрамовіча, які быў затрыманы напярэдадні за ўдзел у "Маршы недармаедаў".

Суддзя **Інэса Южык** вынесла рашэнне аштрафаваць Абрамовіча на 50 базавых велічынь па арт. 23.34 КаАП (арганізацыя і ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве). Вядома, што сведкам на судзе выступаў намеснік начальніка Маладэчанскага РАУС **Яўген Жылінскі**.

Каля 11 гадзін раніцы распачаўся суд над старшынёй Руху "За Свабоду" **Юрасем Губарэвічам**. У выніку разгляду справы лідэр Руху атрымаў 15 сутак арышту. Таксама адбыўся суд над актывісткай БХД **Вольгай Кавальковай**. Яна асуджана на 7 сутак арышту. Лідар АГП **Анатоль Лябедзька** атрымаў 15 сутак арышту. Сустаршыня партыі БХД **Віталь Рымашэўскі** таксама асуджаны на 15 сутак.

Спіс асуджаных на тэрміны ад 7 да 15 сутак за ўдзел у акцыі "Марш недармаедаў" у Маладэчне:

Лябедзька Анатоль
Рымашэўскі Віталь
Бондар Ільля
Панамароў Аляксандр
Губарэвіч Юрась
Аўсянік Ягор
Радкевіч Яуген
Голуб Андрэй
Гмыза Александр
Гмыза Анатоль
Кавалькова Вольга

Увечары 10 сакавіка пасля завяршэнне "Маршу недармаедаў" у Маладэчна пачаліся затрыманні актывістаў. Акрамя Алеся Абрамовіча затрымалі мінскіх актывістаў апазіцыі - **Юрася Губарэвіча**, **Анатоля Лябедзьку**, **Вольгу Кавалькову** і **Віталя Рымашэўскага**, журналіста БелаПАН **Сяргея Каралевіча**, а таксама некалькіх іншых удзельнікаў акцыі. Усіх даставілі ў Маладэчанскі РАУС.

Твитнуть









Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класковская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023





АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе ААН пра Беларусь?

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY